Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
___________ Ю. П. Бондар
«____» ___________ 2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___ /вуч.

# ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ
## Раздзел 2. АСОБА І КУЛЬТУРА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія*
*(фундаментальная) спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01*
*Тэорыя і гісторыя культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнік**

*А. А. Спірына,* старшы выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**Рэцэнзенты:**

*У. Ф. Мартынаў,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар культуралогіі, прафесар;

*А. І. Сцепанцоў,* дацэнт кафедры менеджменту СКД установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 23.02.2011 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 10.05.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А. А. Спірына*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Падрыхтоўка спецыяліста-культуролага ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі прадугледжвае авалоданне ведамі па пытаннях развіцця асобы ў межах сусветнай і айчыннай культуры, а таксама заканамернасцей і дынамікі яе гістарычнага развіцця.

Вучэбная дысцыпліна «Асоба і культура» з’яўляецца важнай складаючай адукацыйнага культуралагічнага цыкла і накіравана на фарміраванне ў студэнтаў сістэмных ведаў і ўяўленняў аб культурагенезе асобы, асаблівасцях яе развіцця ў розных тыпах грамадства, эвалюцыю ўяўленняў пра чалавека, індывідуальнасць, асобу.

Сувязь з іншымі дысцыплінамі ажыццяўляецца з улікам тэарэтычных дасягненняў замежнай і айчыннай культуралогіі, этналогіі, культурнай антрапалогіі і сумежных дысцыплін.

Выкладанне дысцыпліны дазваляе выпрацаваць у студэнтаў аб’ектыўныя падыходы да ацэнкі праяўленняў асобы ў розных культурах, у тым ліку і беларускай, дапамагае ў фарміраванні патрыятычных і грамадзянскіх якасцей, ідэалагічных установак студэнтаў.

*Мэта курса* – фарміраванне сістэмы ведаў аб развіцці асобы, спецыфікі яе фарміравання і рэалізацыі ў сусветнай і айчыннай культурах.

*Задачы курса:*

– засваенне студэнтамі паняццяў і тэрміналогіі вывучаемай дысцыпліны;

– азнаямленне з асноўнымі канцэпцыямі развіцця асобы ў культуры;

– фарміраванне ў студэнтаў уяўлення аб дынаміцы, тэндэнцыях і асаблівасцях развіцця асобы ў культуры;

– азнаямленне з гістарычнымі асаблівасцямі развіцця асобы ў культуры;

– засваенне ведаў аб механізмах станаўлення асобасных якасцей чалавека пасрэдніцтвам міжкультурнай камунікацыі.

У выніку вывучэння дадзенага курса студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя этапы развіцця асобы ў сусветнай культурнай прасторы, іх асаблівасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асноўныя канцэпцыі фарміравання і жыццядзейнасці асобы ў культуры;

– асаблівасці станаўлення асобы ў беларускай традыцыі.

*Умець*:

– характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця асобы ў культуры;

– вызначаць месца і ролю асобы ў беларускай культуры ў агульнаеўрапейскай і сусветнай культурнай прасторы;

– аналізаваць канцэпцыі развіцця асобы чалавека ў культуры;

– характарызаваць асаблівасці культурнай дынамікі станаўлення асобы;

– аналізаваць асноўныя тыпы асобы ў мінулых і сучасных рэгіянальных і лакальных культурах;

– характарызаваць вядучыя канцэпцыі фарміравання і развіцця асобы ў кантэксце сусветных культур.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Асоба і культура» прадугледжана ўсяго 56 гадзін, з іх 40 – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 20, семінары – 20). Рэкамендаваная форма кантролю – залік.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўд. гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| ***Тэма 1.*** Актуальнасць даследавання феномена «асоба» і «культура» | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Чалавек у першабытнай культуры і культуры Старажытнага Усходу | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Чалавек у культуры Антычнасці і Сярэднявечча | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Чалавек культуры Адраджэння і Новага часу | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 5.*** Чалавек у культуры XX ст. | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Рускі (усходнеславянскі) тып асобы і самабытнасць агульнарускай культуры. Асоба ў беларускай традыцыі | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Персаналісцкія канцэпцыі асобы (Э. Мунье, Ж. Лакруа, П. Рыкёр і інш.) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 8.*** Дыялагічныя канцэпцыі развіцця асобы (Э. Левінас, С. Франкл, М. Бахцін, В. Біблер і інш.) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 9.*** Экзістэнцыяльныя ўяўленні развіцця асобы | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 10.*** Мужчынскае і жаночае ў разуменні асобы (О. Вайнінгер) | 2 | | 2 |
| **Разам…** | **40** | **20** | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта дысцыпліны і яе задачы. Месца дысцыпліны ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, сувязь з іншымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Арганізацыя СРС. Формы кантролю.

Чалавек – творца, носьбіт і тварэнне культуры. Паняцці «індывід», «асоба», «чалавек». Адметныя асаблівасці паняццяў «індывід» і «індывідуальнасць». Асобасны ўчынак – адказнасць – асоба. Чалавек – асоба. Сацыяльная скіраванасць асобы.

### *Тэма 1. Актуальнасць даследавання феномена «асоба» і «культура»*

Эвалюцыя ўяўленняў пра чалавека, індывідуальнасці, асобы. Гісторыя паняццяў «асоба» і «культура». Асноўныя культуралагічныя працы па праблеме станаўлення і развіцця асобы ў культуры. Сацыяльная роля асобы ў грамадстве. Маральныя ідэалы і сістэма сацыякультурных каштоўнасцей. Мараль і маральнасць у сістэме культуры.

### *Тэма 2. Чалавек у першабытнай культуры і культуры Старажытнага Усходу*

Касмацэнтрызм і міфалагічная выява свету. Хаос і Космас – праблемы сусветнай гармоніі. Працэс гамінізацыі. Першабытная культура: гамагеннасць, сінкрэтычнасць, табуіраванне. Прынцып пераймання ў прыроды. Культура Старажытнага Усходу: культура Старажытнага Егіпта, культура Месапатаміі, культура Індыі. Спецыфіка светаразумення і светаўспрымання. Асаблівасці сацыяльнага ладу і паўсядзённага жыцця. Асноўныя каштоўнасці, ідэалы і нормы.

### *Тэма 3. Чалавек у культуры Антычнасці і Сярэднявечча*

Агульная характарыстыка культуры Старажытнай Грэцыі. Асноўныя каштоўнасці, ідэалы, нормы старажытнагрэчаскага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства. Антрапацэнтрызм (Пратагор). Ідэя гарманічнага развіцця асобы. Гуманнасць правасвядомасці старажытных грэкаў.

Агульная характарыстыка культуры Старажытнага Рыма. Асноўныя каштоўнасці, ідэалы, нормы старажытнарымскага грамадства. Рацыяналізм і яго ўплыў на развіццё асобы. Ідэя грамадзянскага выхавання асобы (паняцце «сацыяльная дысцыпліна»).

Агульная характарыстыка культуры Сярэднявечча. Тэацэнтрызм. Аскетызм. Хрысціянізацыя і яе ўплыў на фарміраванне і развіццё асобы. Рэлігійны фанатызм. З'яўленне манаскіх ордэнаў і іх уплыў на фарміраванне ідэальных якасцей асобы.

### *Тэма 4. Чалавек культуры Адраджэння і Новага часу*

Агульная характарыстыка культуры Адраджэння. Зварот да антычнасці і змена светаўспрымання. Гуманістычнае вучэнне пра чалавека і яго асноўныя характарыстыкі (Дж. Манэцці). Ідэя тоеснасці свету прыроды і свету культуры. Крызіс рэлігійнай выявы свету.

Сацыяльна-палітычныя дэтэрмінанты фарміравання культуры Новага часу.

Асновы светапогляду і светаразумення гэтага перыяду. Культ навукі і тэхнікі. Секулярызацыя культуры і быту. Асноўныя канцэпцыі паходжання, развіцця і існавання чалавека (асобы) у свеце (Д. Дзідро, Вальтэр, Ж.-Ж. Русо і інш.). Уплыў культуры на станаўленне асобы. Ідэалы, каштоўнасці, нормы, сэнсы культуры Новага часу.

### *Тэма 5. Чалавек у культуры XX ст.*

Агульная характарыстыка культуры XX ст. Асновы светапогляду і светаразумення гэтага перыяду. Крызіс каштоўнасцей розуму, прагрэсу і самабытнасці свету ў познім індустрыяльным грамадстве. Культура мадэрну як пошук новых духоўных асноў быцця. Асноўныя канцэпцыі паходжання, развіцця і існавання чалавека (асобы) у свеце. Уніфікацыя культуры і яе ўплыў на станаўленне асобы. Ідэалы, каштоўнасці, нормы, сэнсы культуры XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Феномен постмадэрнізму і яго адметныя ўласцівасці. Рост культурнай разнастайнасці. Узаемадзеянне культур, міжкультурная камунікацыя. Дыялог культур. Варыянты існавання асобы ў межах культуры постмадэрнізму. Асноўныя канцэпцыі паходжання, развіцця і існавання асобы (Ж.-Ф. Ліатар, Ж. Дэлёз і інш.).

Масавае грамадства і культура. Тэхналагічныя і сацыяльныя дэтэрмінанты фарміравання чалавека масавай культуры. Механізм масавай культуры і яе функцый. Футуралогія аб глабальным мадэліраванні розных аспектаў развіцця і жыццядзейнасці асобы.

### *Тэма 6. Рускі (усходнеславянскі) тып асобы і самабытнасць агульнарускай культуры. Асоба ў беларускай традыцыі*

Характарыстыка рускага тыпу асобы. Асноўныя канцэпцыі рускага тыпу асобы (У. С. Салаўёў, М. А. Бярдзяеў, А. Хамякоў і інш.), асноўныя яго катэгорыі і характарыстыкі. Асаблівасці светапогляду і светаразумення рускага тыпу асобы. Ідэалы, каштоўнасці, нормы, сацыяльныя зносіны ў агульнарускай культуры.

Асаблівасці развіцця і фарміравання асобы ў гісторыі беларускай культуры. Хрысціянскі гуманізм беларускіх асветнікаў: Е. Полацкая, К. Тураўскі, К. Смаляціч, А. Смаленскі. Светапоглядныя канцэпцыі С. Буднага, В. Цяпінскага, А. Волана і інш. Станаўленне і развіццё беларускай мовы, пісьменнасці і літаратуры як асноўных складальнікаў станаўлення асобы (М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі). Асноўныя канцэпцыі развіцця асобы ў беларускай традыцыі (І. Абдзіраловіч, М. Багдановіч, А. Цвікевіч і інш.).

### *Тэма 7. Персаналісцкія канцэпцыі асобы (Э. Мунье, Ж. Лакруа, П. Рыкёр і інш.)*

Асоба ў персаналісцкай трактоўцы: адзінства трох асноўных характарыстык (экстэрыярызацыя, інтэрыярызацыя і трансцэндэнцыі). Месца культуры ў асобасным развіцці чалавека. Фундаментальная ідэя персаніфікацыі Бога і яе акцэнтоўка на непаўторнасць і максімальную каштоўнасць асобы. Асоба і яе духоўныя каштоўнасці – вышэйшы сэнс зямной цывілізацыі. Асноўныя тыпы свядомасці асобы (Э. Мунье). Воля і здольнасць да самавызначэння – асноўныя кампанен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ты развіцця асобы. Культуратворчы працэс асобы (Ж. Лакруа). Прыярытэтнасць масавай культуры штодзённасці ў развіцці асобы.

### *Тэма 8. Дыялагічныя канцэпцыі развіцця асобы (Э. Левінас, С. Франкл, М. Бахцін, В. Біблер і інш.)*

Дыялагічныя высновы станаўлення асобы і культурфіласофія М. Бубера («Я» і «Ты», «Дыялог»). Культурныя ўстанаўленні «Я – Ты», «Я – Яно». Дыялог як эмпатычныя адносіны. Дыялог з людзьмі і з Богам – асноўныя падставы для асобаснай жыццядзейнасці. Канцэпцыя аўтэнтычных стасункаў паміж асобамі і культурамі Э.Левінаса. Дыялог як сродак стварэння культурных сэнсаў. Каштоўнасць Іншага. Прынцып «асіметрыі дыялагічнай прасторы».

### *Тэма 9. Экзістэнцыяльныя ўяўленні развіцця асобы*

Жыццё асобы як цэнтральнае паняцце экзістэнцыяльнага падыходу. Асноўныя экзістэнцыяліі: быццё, свабода, трывога, нішто і інш. Тыпы экзістэнцыяльных уяўленняў – рэлігійны і атэістычны: рознае і супольнае ў іх.

Рэлігійны экзістэнцыялізм. Экзістэнцыяльная камунікацыя К. Ясперса. Узроўні быцця асобы. Культурная функцыя чалавека.

Атэістычны экзістэнцыялізм. Ж.-П. Сартр: канцэпцыя фарміравання асобы. Свабода выбару і адказнасць чалавека. Быццё пад позіркам Іншага. Пагранічная сітуацыя. А. Камю: «абсурд» і выбар асабістай пазіцыі. «Абсурдны бунт». Гісторыка-культурныя формы бунту.

### *Тэма 10. Мужчынскае і жаночае ў разуменні асобы (О. Вайнінгер)*

Асноўныя кампаненты асобаснай свядомасці: вобласць рэчаіснасці і індывідуальнае мысленне. Гістарычная трансфармацыя паняццяў «ідэальны мужчына» і «ідэальная жанчына». Уплыў інтэнсіўнасці праявы мужчынскага і жаночага пачаткаў на станаўленне асабістых якасцей чалавека. Асноўныя законы жыццядзейнасці асобы. Псіхалагічныя тыпы мужчыны і жанчыны. Геніяльнасць асобы: сутнасць і асноўныя яе складальнікі (шматграннасць, самааналіз, назіральнасць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні да іспыту

1. Чалавек – творца, носьбіт і тварэнне культуры. Чалавек. Індывід. Асоба.

2. Актуальнасць даследавання феномена «асоба» і «культура».

3. Эвалюцыя ўяўленняў аб чалавеку, індывідуальнасці, асобе.

4. Узроўні праявы феномена «асоба» і «культура».

5. Персаналісцкія канцэпцыі асобы (Э. Мунье, Ж. Лакруа, П. Рыкёр і інш.).

6. Асобасныя якасці як фактар культурагенеза.

7. Дыялагічныя канцэпцыі развіцця асобы (Э. Левінас, С. Франкл, М.Бахцін, В.Біблер і інш.).

8. Экзістэнцыяльныя ўяўленні развіцця асобы.

9. Атэістычная інтэрпрэтацыя станаўлення і развіцця асобы Ж. Сартра.

10. Абсурднасць чалавечага быцця (А. Камю).

11. Блазнерства, юродзівыя. Смехавая культура.

12. Мужчынскае і жаночае ў разуменні асобы (О. Вайнінгер).

13. Экстравертны і інтравертны пачаткі ў асобы і ў культуры (К. Юнг).

14. Матрыярхат і патрыярхат. Сучасная гендарная праблематыка і з'явы фемінізацыі ў культуры.

15. Заходні і ўсходні тыпы «асобы» і «культуры».

16. Натоўп, маса, класы і асоба. Масавая культура.

17. Арыстакратыя, эліта, бамонд. Элітарная культура.

18. Канцэпцыя Звышчалавека і яе інтэрпрэтацыя ў сучаснай культуры.

19. Культ асобы. Воля асобы.

20. Постмадэрнісцкі падыход да вызначэння асобы.

21. Уяўленні аб рэальнасці чалавечага быцця Ж.-Ф. Ліатара.

22. «Шызафрэнічная» культура ў канцэпцыі Ж. Дэлёза.

23. Этнапсіхалагічныя праблемы культуры.

24. Чалавек у архаічнай культуры.

25. Асоба ў культуры Старажытнага Усходу. Касмацэнтрызм.

26. Чалавек у культуры Сярэднявечча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

27. Чалавек культуры Адраджэння.

28. Асобасная драма індустрыяльнага грамадства. Дэградацыя асобы.

29. Асоба ў таталітарных рэжымах.

30. Актуальныя гледжанні на эвалюцыю асобы і яе роля ў касмагенезе.

31. Асоба ў перыяд глабалізацыі.

32. Асоба ў культуры постмадэрнізму.

33. Вызваленне асобы. Права на шчасце, волю.

34. Будучыня асобы. Сучасная інтэрпрэтацыя міфалагемы-канцэпцыі вечнага вяртання.

35. Рускі (усходнеславянскі) тып асобы і самабытнасць агульнарускай культуры.

36. Асоба ў беларускай традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Алексеев, В. П.* Становление человечества / В. П. Алексеев. – М.: Знание, 1984. – 265 с.

3. *Артемова, О. Ю.* Личность и социальные нормы в раннепервобытной общине / О. Ю. Артемова. – М.: Знание, 1987. – 354 с.

4. *Библер, В. С.* Культура. Диалог культур / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 33–38.

5. *Библер, В. С.* Нравственность. Культура. Современность (Философские размышления о проблемах) / В. С. Библер. – М.: Знание, 1990. – 426 с.

6. *Гуревич, П. С.* Культурология / П. С. Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.

7. *Иконникова, С. Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С. Н. Иконникова. – СПб.: С.-Петерб. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.

8. *Кон, И. С.* В поисках себя: Личность и ее самосознание / И. С. Кон. – М.: Знание, 1984. – 387 с.

9. *Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск: АСАР, 2008. – 848 с.

10. *Усовская, Э. А.* Постмодернизм в культуре XX в. / Э. А. Усовская. – Минск: БГУ, 2003. – 63 с.

*Дадатковая*

1. *Абаев, Н. В.* Чань-буддизм и культурно-психологические традиции в средневековом Китае / Н. В. Абаев. – Новосибирск: Университет, 1999. – 369 с.

2. *Аверинцев, С.* Два рождения европейского рационализма / С. Аверинцев // Вопросы философии. – 1989. – № 3. – С. 12–16.

3. *Бердяев, Н. А.* Философия творчества, культуры и искусства / Н. А. Бердяев. – М.: Знание, 1994. – 482 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Витгенштейн, Л.* Культура и ценность / Л. Витгенштейн // Человек. – 1991. – № 5. – С. 6–10.

5. *Гуревич, А. Я.* Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А. Я. Гуревич. – М.: Искусство, 1990. – 396 с.

6. *Данилевский, Н. Г.* Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому / Н. Г. Данилевский. – М.: Книга, 1991. – 574 с.

7. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

8. *Камю, А.* Бунтующий человек / А. Камю. – М.: Политиздат, 1990. – 415 с.

9. *Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М.: Мысль, 1982. – 623 с.

10. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

11. *Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет // Х. Ортега-и-Гассет. Избранные труды. – М.: Весь мир, 2000. – 704 с.

12. *Силуянова, И. В.* Духовность как способ жизнедеятельности человека / И. В. Силуянова // Философские науки. – 1990. – № 12. – С. 15–19.

13. *Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М.: АСТ, 2004. – 220 с.

14. *Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Минск: Коллегиум, 1997. – 253 с.

15. *Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья / Й. Хёйзинга. – М.: Наука, 1988. – 544 с.

16. *Эко, У.* Средние века уже начались / У. Эко // Иностранная литература. – 1994. – № 4. – С. 12–19.

17. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М.: Канон, 1994. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ**
**Раздзел 2. АСОБА І КУЛЬТУРА**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія*
*(фундаментальная) спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01*
*Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,45.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ